**Тухта, В.** Дэсант, наперад! / В. Тухта // Лепельскі край. — 2014. — 14 лют. — С. 1.

# ДЭСАНТ, НАПЕРАД!



У пачатку снежня ўжо далёкага 1979 года ўраджэнец Велеўшчыны Віктар Пыцько быў у шэрагу першых савецкіх дэсантнікаў, якія ступілі на выпаленую сонцам афганскую зямлю. Для забеспячэння працы аэрадрома Баграм і аховы тэхнічнага персаналу і грузаў з Ферганы была перакінута аператыўная група 345-га асобнага парашутна-дэсантнага палка на чале з камандзірам і 2-м батальёнам з баявой тэхнікай і грузамі. Дэсантнікі былі накіраваны ў Афганістан пад выглядам тэхнічнага абслугоўвання авіяцыі на аэрадроме Баграм, дзе размяшчаліся савецкія самалёты і верталёты. Віктар узгадвае, што маскіроўка была максімальнай, на форме яны насілі знакі адрознення лётчыкаў. Афіцэрскі састаў быў замаскіраваны пад сяржантаў. Толькі салдаты тэрміновай службы мелі чырвоны колер лычак, а афіцэры жоўты. Напрыклад, лейтэнант меў адну яфрэйтарскую лычку жоўтага колеру.

У баявой біяграфіі земляка – шмат запамінальных эпізодаў. Менавіта Віктар сядзеў за рычагамі БМД, які вёз з Баграма ў Кабул новага кіраўніка Афганістана Бабрака Кармаля. Пра гэта ён даведаўся пазней, а тады атрымаў лаканічны загад любым чынам даставіць пасажыра да месца назначэння. Не здагадваўся Віктар, што чалавек у традыцыйным афганскім адзенні, які сядзіць у дэсантным адсеку баявой машыны ў атачэнні супрацоўнікаў КДБ, – важная персона. Два тыдні да гэтага Бабрак Кармаль жыў на базе ў дэсантнікаў, якія між сабой назвалі афганца Коля Баброў.

Размешчаны ў Баграме парашутна-дэсантны полк лічыўся адной з самых «ваюючых частак» 40-й арміі. Яго дэсантнікі часцей бывалі на «баявых», чым на тэрыторыі ваеннага гарадка. Кожны дзень у далёкай горнай краіне быў насычаны цяжкай баявой работай, у якой даводзілася губляць таварышаў. Прапаршчык Пыцько выконваў у падраздзяленні абавязкі нампатэха, але на базе ён не адседжваўся, хадзіў на «баявыя» нароўні з усімі. Спачатку «духі» не вельмі дакучалі. Сур’ёзныя страты полк пачаў несці летам 1980-га, калі ўступілі ў супрацьборства з наёмнікамі. Падчас аднаго бою ў роце, дзе служыў Віктар, засталося дваццаць чалавек асабовага складу. Былі выпадкі, што ва ўзводах пасля аперацый заставалася па два – тры чалавекі.

Асабліва адклалася ў памяці ветэрана, як на міне падарвалася БМД, а затым па ёй «душманы» ўдарылі яшчэ і з гранатамёта. У адначассі загінула сямёра чалавек. Тады, гарачым летам 1980-га, дэсантнікі набіраліся вопыту, вучыліся ваяваць з небяспечным ворагам.

Аднойчы, рыхтуючыся да палявога выхаду, унутраны голас падказаў Віктару надзець бронекамізэльку, якой звычайна карыстаўся мала. Дэсанціраваўшыся з «брані», падраздзяленне дэсантнікаў паспела прайсці горнай сцяжынкай некалькі соцень метраў, як аднекуль ударылі аўтаматныя чэргі. Адна з іх апракінула на зямлю Віктара, які і зразумець нічога не паспеў, толькі дыханне перацяло ад моцнага болю ў грудзях. Справа абышлася двума паламанымі рабрынамі. Магчыма, тады ўпершыню і задумаўся, што нейкая звышнатуральная сіла ўратавала ад немінучай пагібелі.

Праз некалькі месяцаў, будучы на пабыўцы ў бацькоў, не супраціўляўся, калі маці ў дарогу дала святое пісьмо, каб зберагала на вайне. Гэты своеасаблівы засцярог Віктар Міхайлавіч і цяпер ашчадна захоўвае ў сваіх дакументах.

За «афганскую» вайну Віктар Пыцько ўзнагароджаны медалямі «За адвагу», двума «За баявыя заслугі», «За адзнаку ў воінскай службе» першай і другой ступеняў.

У сонечную Фергану «з-за рэчкі» Віктар вярнуўся напрыканцы 1981 года, праслужыўшы ў Афганістане ў агульнай колькасці дваццаць пяць месяцаў.

Службу ў паветрана-дэсантных войсках Віктар Міхайлавіч лічыў сваім прызваннем. Ён быў прафесіяналам сваёй справы, сапраўдным дэсантнікам. Здзейсніў больш за чатырыста скачкоў с парашутам, з’яўляўся інструктарам парашутна-дэсантнай падрыхтоўкі, праходзіў службу ў разведвальным падраздзяленні. Маючы багаты баявы вопыт, перадаваў яго маладым, якіх яшчэ чакала камандзіроўка на вайну. Абставіны склаліся так, што, аддаўшы войску лепшыя гады свайго жыцця, вымушаны быў звольніцца ў запас. Зараз аб гэтым ветэран-«афганец» не шкадуе. Далей пайшоў па жыцці іншым, мірным, шляхам, сваё другое прызванне знайшоўшы на зямлі, працуючы механізатарам і аграномам.

**Валерый Тухта**

**На здымку: Віктар Пыцько**